

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*№ 4 (215) 9 чэрвеня 1994 года, чацвер*

### Васіль Быкаў:

## "Моладзь зразумее больш"

Сваю надзею на новае пакаленне выказаў народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў на сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.

Гэта было яго першае публічнае выступленне ў Гродне пасля 1978 года, калі Быкаў пераехаў жыць у Мінск.

І вось, праз гады,-- сустрэча з гродзенцамі, сустрэча напярэдадні 70-гадовага юбілею Васіля Уладзіміравіча, які будзе адзначацца 16 чэрвеня.

Аб чым гаварыў Быкаў ва універсітэцкай зале? Найперш, што з Гродна ў яго звязаны добры кавалак жыцця, які ва ўяўленні пісьменніка застаўся як самы светлы.

Адказваючы на пытанне аб сённяшнім стане беларускай літаратуры, пісьменнік зазначыў: літаратура таксама ў крызісным стане, як і грамадства. На гэтым гістарычным перакрыжаванні, -- па яго перакананні -- палітыка выходзіць на першы план. Быкаў перакананы, што сёння галоўнае для Беларусі -- будаўніцтва сваёй дзяржаўнасці. Калі дасягнем гэтага -- будзе і ўсё астатняе. Таму на прэзідэнцкіх выбарах ён прагаласуе за З. Пазняка.

Чаму так доўга Быкаў не прыязджаў у Гродна? Магчыма, адказам на гэтае пытанне будуць яго поўныя горычы словы аб тым, што "у гэтай зале не так даўно засядалі іншыя людзі, тут шмат непрыемных хвілін перажылі гродзенскія літаратары, цяпер час змяніўся, некуды адыйшлі, зніклі тыя людзі..."

Гродзенскі універсітэт -- асяродак маладосці. Маладыя людзі сёння ў стане вялікай няпэўнасці. І ўсё ж,-- па словах В. Быкава -- "народ спадзяецца на студэнцтва, на моладзь, якая зразумее больш, чым зразумелі старыя". "Шчаслівага вам жыцця!" -- сказаў на развітанне Васіль Уладзіміравіч.

Р. ВАЙНІЦКІ.

Фатаграфаваў А. УЛАДАСЕВІЧ.



## Якім быць нацыянальнаму універсітэту?

Пасяджэнне "круглага стала" з такой назвай прайшло ў канферэнц-зале нашага універсітэта. Удзельнічалі ў ім члены камісіі Міністэрства адукацыі краіны, якія прыехалі ў Гродна напярэдадні калегіі, якая павінна абмеркаваць перспектывы развіцця універсітэтаў на Беларусі. Прыйшлі на пасяджэнне "круглага стала" дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў, выкладчыкі -- усе, каго зацікавіла тэма размовы.

Якім жа быць нацыянальнаму універсітэту? Самыя розныя, часта процілеглыя думкі гучалі ў ходзе дыскусіі. У нашым універсітэце ўжо не першы месяц абмяркоўваецца праграма, якую прапанаваў новы рэктар Л. М. Ківач. І пасяджэнне "круглага стала" стала працягам тых спрэчак, markdown розную разумення самой сутнасці значэння -- нацыянальны універсітэт.

Госць з Мінска, дацэнт Белдзяржуніверсітэта П. Цярашковіч выказаўся за такі змест беларусізацыі, які задаволіў бы ўсе бакі. Гаворачы аб мове выкладання, ён напомніў, што ў Пражскім універсітэце яшчэ перад Другой сусветнай вайной выкладалі па-нямецку, а не па-чэшску. На думку П. Церашковіча: -- "Не трэба фецішызаваць моўнае пытанне, а звяртаць увагу на змест". Ен выказаўся за кампраміс, каб дазволіць частцы выкладчыкаў самім выбіраць мову выкладання.

Слова бярэ дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры І. Жук: -- "Адраджэнне павінна ісці праз адукацыю. Асноўная задача тут кладзецца на універсітэты, якія рыхтуюць рэпрэзэнтантаў дзяржавы. Мы павінны ісці шляхам стварэння нацыянальнага універсітэта. Што да мовы выкладання, то, безумоўна, яна павінна быць беларуская. Нацыянальны універсітэт -- перш за ўсё -- духоўнасць. Фактар духоўны будуе адукацыю цераз выхаванне нацыянальнай свядомай інтэлігенцыі".

А. Пяткевіч, загадчык кафедры беларускай культуры: "Мне не падабаецца тэрміналогія "нацыянальны кампанент". Трэба гаварыць пра сістэму нацыянальнай культуры. Гэта павінна праяўляцца не толькі ў мове, не толькі ва ўвядзенні гуманітарных прадметаў, а ва ўсёй сістэме дзейнасці універсітэта". Аляксей Міхайлавіч напомніў, што яго кафедра склала праграму па гісторыі беларускай культуры, і праграма гэтая перакідваецца з аддзела ў аддзел Міністэрства адукацыі. Свой пункт гледжання выказаў А. Пяткевіч на прапановы мінскай камісіі: "Не думаю, што кампрамісы -- добра. Галоўнае, што перашкаджае нашым выкладчыкам перайсці на беларускую мову -- псіхалагічная непадрыхтаванасць".

У выступленнях прадстаўнікоў філалагічнага і біялагічнага факультэтаў, факультэта правазнаўства выразна акрэслілася такая пазіцыя: пераход на беларускую мову выкладання неабходны, але гэта трэба рабіць паступова, пакрысе. Пакуль жа няма падручнікаў, дапаможнікаў, не распрацавана тэрміналогія.

Падтрымала такі настрой А. Рашчынская, кіраўнік камісіі Міністэрства. Яна таксама за тое, каб ва універсітэце ішоў працэс беларусізацыі, але... "большасць беларусаў думаюць па-руску, і як ад іх адмахнуцца? Значыць, трэба шукаць выйсце палюбоўна, не абвастраць сітуацыі".

Дык якім усё ж-такі павінен быць нацыянальны універсітэт? Гэта асноўнае пытанне "круглага стала" так і павісла ў паветры...

М. МЯЦЯВІЦКІ.

## Зацверджаны асноўныя прынцыпы арганізацыі НДС

29 Красавіка адбылося чарговае пасяджэнне Вучонай рады універсітэта. Члены Вучонай рады слухалі паведамленне першага прарэктара А. Краўцэвіча аб зацвярджэнні асноўных прынцыпаў арганізацыі навукова-даследчай работы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я. Купалы.

Вучоная рада зацвердзіла асноўныя прынцыпы арганізацыі НДР, асноўныя прынцыпы арганізацыі НДРС ва ўмовах пераходу на шматузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў.

Факультэтам у тэрмін да першага верасня б. г. распрацаваць Палажэнні аб арганізацыі НДРС з профілем падрыхтоўкі спецыялістаў кожнага факультэта.

Кантроль за выкананнем пастановы ўскладзены на першага прарэктара.

Н. ПЯТРОВА.

**Шаноўны Ігар Давыдавіч Розенфельд!** Віншуем Вас з нагоды 60-гадовага юбілею!

Жадаем Вам плённага жыцця, усіх чалавечых зямных радасцей, ажыццяўлення творчых планаў. Заставайцеся заўжды бадзёрым, энергічным навукоўцам і чалавекам. Жывіце доўга і шчасліва.

**Калегі, вучні.**

## Адзін з самых вядомых беларускіх псіхолагаў наведаў наш універсітэт

Па запрашэнню кафедры псіхалогіі ў нашым універсітэце з цыклам лекцый выступіў Я. Л. Каломінскі -- доктар псіхалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры агульнай і дзіцячай псіхалогіі Мінскага педагагічнага універсітэта. Выдатны спецыяліст у галіне сацыяльнай, узроставай і педагагічнай псіхалогіі, Якаў Львовіч з`яўляецца правадзейным членам Міжнароднай Акадэміі вышэйшай школы і Міжнароднай Акадэміі Акмеалагічных навук.

Навуковыя публікацыі Я. Л. Каломінскага, многія з якіх перакладзены на замежныя мовы, узбагацілі псіхалагічную навуку, маюць вялікае значэнне для тэорыі і практыкі навучання і выхавання. Шырокай вядомасцю карыстаюцца яго навукова-папулярныя кнігі ("Чалавек среди людей", "Беседы о тайнах психики", "Познай самого себя", "Человек: психология" і інш.). Для студэнтаў II курса спецыяльнасці "Псіхалогія" біялагічнага факультэта ім прачытаны спецкурс "Сацыяльная псіхалогія дзяцінства", заснаваны на выніках тэарэтычнага і эксперыментальнага даследавання на ранніх стадыях індывідуальнага развіцця.

Навуковая эрудыцыя, усебаковая адукаванасць і высокі ўзровень метадычнага майстэрства Я. Л. Каломінскага зрабілі яго лекцыі цікавымі і прывабнымі не толькі для студэнтаў II курса: іх наведалі студэнты іншых курсаў і факультэтаў, выкладчыкі ВНУ, школьныя псіхолагі і настаўнікі. Вялікую аўдыторыю сабрала лекцыя Якава Львовіча "Псіхолаг адкрывае Амерыку", дзе ён падзяліўся сваімі ўражаннямі ад навуковых камандзіровак у ЗША, пазнаёміў з цікавымі відэаматэрыяламі аб вядомым псіхалагічным эксперыменце Ф. Зімбарда. Якаў Львовіч правёў таксама кансультацыі з аспірантамі кафедры псіхалогіі і студэнтамі спецыяльнасці "Псіхалогія".

К. ВЕРБАВА,
дацэнт кафедры псіхалогіі.

## Аб літаратурна-лінгвістычных сувязях Беларусі, Расіі і Польшчы

16--19 траўня на кафедры польскай філалогіі нашага універсітэта прайшла 3-я міжнародная канферэнцыя "Польская мова і літаратура ў кантэксце славянскіх культур". Яна з`яўляецца часткай працы па міжнароднай тэме "Польская літаратура. Беларуска-польска-рускія літаратурна-лінгвістычныя сувязі". Гэта тэма на працягу 5-ці гадоў звязвае кафедру польскай філалогіі з інстытутам славяназнаўства РАН, Гданьскім універсітэтам і Кракаўскім педагагічным інстытутам.

Месцам спаткання Гродзенскі універсітэт выбраны не выпадкова. З даўніх часоў культура нашага краю ствараецца агульнымі намаганнямі народаў, якія тут жывуць. З Гродзеншчынай звязана творчасць А. Міцкевіча, Э. Ажэшкі, М. Багдановіча, В. Быкава.

Канферэнцыя была прысвечана памяці беларускага пісьменніка А. Н. Карпюка, у 1992 г. Англійскім міжнародным біяграфічным цэнтрам у Кэмбрыджы прызначанага чалавекам году. І першым, натуральна, было слова аб Аляксеі Карпюку І. Жука (ГрДУ), які раскрыў своеасаблівасці творчасці пісьменніка. Дакладчык паказаў сувязь твораў Карпюка з жыццём народу, іх арыгінальнасць і непаўторны рэгіянальны каларыт. Інтэлектуальнае жыццё Гродзеншчыны цяжка ўявіць без А. Н. Карпюка, але засталіся яго кнігі, архіўныя матэрыялы, пісьмы, яны сведчаць не толькі аб творчых магчымасцях, але і аб веліччы душы гэтага чалавека, аб яго сувязях з дзеячамі культур розных краін. Аб гэтым паведаміла ўдава пісьменніка І. А. Карпюк. Яе даклад абапіраўся на дакументальна-архіўныя крыніцы, упершыню ўведзеныя ў літаратуразнаўчую практыку.

Тэма канферэнцыі дазволіла вызначыць асноўныя кірункі яе работы: польская літаратура ў яе гісторыка-тэарэтычным аспекце, літаратурна-лінгвістычныя і культурныя сувязі славянскіх народаў, параўнальныя сацыялагічныя даследаванні псіхалогіі студэнтаў-паланістаў Гродзенскага і Гданьскага універсітэтаў, рэгіянальная Гродзенская праблематыка з яе спрадвечнымі сувязямі са славянскімі культурамі і фальклорам іх народаў.

Хочацца адзначыць наватарскі характар канферэнцыі, у якой вызначылася зацікаўленасць і новымі навуковымі матэрыяламі ўдзельнікаў, неардынарнымі падыходамі і арыгінальнымі рашэннямі пастаўленых праблем. Усё гэта стварала па-сапраўднаму творчую, дыскусійную атмасферу ў яе працы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

# Аб літаратурна-лінгвістычных сувязях Беларусі, Расіі і Польшчы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Высокі інтэлек-туальны ўзровень кан-ферэнцыі вызначыў В. А. Хораў (РАН) у дакладзе "Аб вытоках і развіцці этнічных стэрэатыпаў". Выдатны вучоны не толькі падняў адну з актуальных праблем, але і вырашыў яе своеасабліва на матэрыяле некалькіх славянскіх літаратур і філасофскіх працаў.

Праблема сувязі польскай літаратуры са светам славянскіх культур была адной з найважнейшых і вырашалася ў розных аспектах і накірунках. С. А. Шарлаімава (РАН) паказала ўзаемадзеянне літаратуры з нацыянальнай самасвядомасцю і грамадскай крытыкай на прыкладах польскага і чэшскага рамана 20-х гадоў. А. З. Цыбенка (МДУ) прасачыла канцэптуальнае і мастацкае падабенства раманаў Арцыбашава ("Санін") і Пшыбышэўскага ("Homo sapiens"). Польскую і чэшскую драму "Іншадумства" даследавала І. В. Шаблоўская (БДУ), сувязямі лірыкі Я. Івашкевіча з нямецкім імпрэсіянізмам прысвечаны даклад Л. М. Гарданавай (ГрДУ), В. В. Цыбенка даследавала лагерную тэму ў творчасці Г. Херлінга-Грудзінскага і В. Шарламава.

Не менш значнымі былі даклады, прысвечаныя праблемам развіцця польскай літаратуры. Ю. Бахуж (Гданьскі універсітэт) на аснове недаследаваных матэрыялаў рукапіснага архіву Э. Ажэшкі ў новым святле паказаў гісторыю стварэння рамана "Над Нёманам". Х. Бурштынская (Кракаўскі педінстытут) увяла ўдзельнікаў канферэнцыі ў свет першых апавяданняў Ажэшкі. Лёсам "трагічнага пакалення" у польскай літаратуры 30-х гг. быў прысвечаны даклад С. П. Мусіенка



(ГрДУ). М. Чармінская (Гданьскі універсітэт) даследавала беларускія матывы ў лірычным рамане З. Жакевіча. Праблемы навуковай фантастыкі ў творчасці С. Лема раскрыла Д. Р. Мышка (ГрДУ). Тэорыю і гісторыю жанру шляхецкай "чавэнды" прадставіла А. І. Карпава (ГрДУ). Жаночыя вобразы ў творчасці С. Грабінскага сталі аб'ектам увагі Л. Л. Бараненкавай (ГрДУ).

На праблемах "памежжа" літаратур спыніліся польскія даследчыкі Е. Асоўскі ("Шчасце ў Вільні..." Аб віленскай паэзіі К. У. Галчынскага) і Б. Аляксовіч ("Тэафіл Ленартовіч: "Аб характары паэзіі польска-славянскай").

Выклікалі цікавасць і факталагічныя даследаванні, асабліва звязаныя з вывучэннем культуры Гродзенскага рэгіёна. Т. Будрэвіч (Кракаўскі педінстытут) спыніўся на паказе Свіслачы ў польскай літаратуры XIX ст. Легенды Гродзеншчыны сабраў С. І. Пачабут (Гродна). Д. І. Вянсковіч (ГрДУ) расказала аб творчай дзейнасці беларускага вучонага Б. Тарашкевіча ў сценах гродзенскай турмы. С. Росек (Гданьскі універсітэт) прадставіў новыя матэрыялы аб удзеле ў пахаванні А. Міцкевіча ў Канстантынопалі групы славян.

Адзначым своеасаблівасць лінгвістычных дакладаў. У даследаванні Э. Брэзы (Гданьскі універсітэт) паказана фарміраванне кашубскай літаратурнай мовы. Праблемам параўнальнага мовазнаўства былі прысвечаны даклады Т. Ацаркінай (МДУ) і К. З. Булай (ГрДУ).

Г. У. Ярмоленка даследаваў дзве асноўныя праблемы мовазнаўства: моўны строй і моўнае ўжыванне.

Ролю і функцыі мовы, як асноўнай састаўляючай у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, веры і культуры беларускага народу ў XIX ст. паказаў А. М. Пяткевіч (ГрДУ).

У шэрагу дакладаў вырашалася праблема рэцэпцыі польскай літаратуры ў славянскіх краінах. Н. Н. Старыкава (РАН) прадставіла своеасаблівыя складаныя шляхі ўспрымання польскай прозы і паэзіі ў Славеніі 20—30 гг. Аб навукова-пазнавальным значэнні апошніх лістоў Э. Ажэшкі паведаміў В. К. Шыцік (ГрДУ). І. Плонка (Кракаўскі педінстытут) звярнулася да пытання аб інтэркрэтацыі творчасці Э. Ажэшкі ў школьных падручніках, а М. Гайба (Навагрудскі музей) — да інтэрпрэтацыі жыхара Навагрудчыны польскімі аўтарамі на пачатку XX ст. Першае параўнальна-сацыялагічнае даследаванне студэнтаў польскай філалогіі Гданьскага і Гродзенскага універсітэтаў правёў К. Сопух (Гданьскі універсітэт).

Можна адзначыць удалы старт маладых беларускіх паланістаў аспірантаў БДУ М. Хмяльніцкага і ГрДУ А. Гартунга, студэнтаў польскай філалогіі Гродзенскага універсітэта В. Курловіч, У. Хлістоўскай, Ю. Гумянюка, якія выступілі са сваімі першымі навуковымі працамі. Даклады студэнтаў былі адзначаны прэміяй, якую з уласных сродкаў выдала прафесар Гданьскага універсітэта М. Чамінская.

Заключным этапам канферэнцыі была экскурсія ў Багатырэвічы да магілаў Яна і Цэцыліі і паўстанцаў 1863 г.

**С. МУСІЕНКА,**
**загадчык кафедры польскай філалогіі, старшыня аргкамітэту міжнароднай канферэнцыі.**

**НА ЗДЫМКУ: удзельнікі канферэнцыі.**

**Фатаграфаваў У. САРОКІН.**

## "Беласточчына" павінна згуртаваць

У вышэйшых навучальных установах Гродна, Мінска і Віцебска займаюцца юнакі і дзяўчаты з Беласточчыны. Усяго іх каля ста чалавек. Нядаўна яны стварылі сваё студэнцкае аб'яднанне "Беласточчына".

Сябра аргкамітэту, студэнт гістарычнага факультэта нашага універсітэта Яўген Янчук так акрэсліў задачы аб'яднання: "Яно павінна згуртаваць нас".

Студэнты-беларусы прыехалі з розных гарадоў і вёсак Падляшша і натуральна, што многія нават не знаёмыя паміж сабой. Аб'яднанне дапаможа зблізіцца, разам адпачываць, больш даведацца пра гісторыю і культуру Беларусі, а таксама паспрыяе і ў вырашэнні шматлікіх праблемаў, з якімі сутыкаецца моладзь з Беласточчыны.

Пачнем хаця б з таго, што стыпендыю яны атрымліваюць такую ж, як і ўсе студэнты — у беларускіх рублях. Вядома, што на такія грошы не пражывеш і трэба прасіць дапамогу ў бацькоў.

Ці вось такая акалічнасць. Калі хлопцы і дзяўчаты ехалі да нас на вучобу, то спадзяваліся, што будуць знаходзіцца ў беларускамоўным асяродку, змогуць узбагаціць свае веды. Аднак рэчаіснасць многіх расчаравала. Зрэдку пачуеш, каб нашыя студэнты ў Гродна ці Мінску размаўлялі паміж сабой па-беларуску, інстытуты і універсітэты далёка не нацыянальныя па зместу адукацыі.

Праблемаў шмат. І студэнцкае аб'яднанне "Беласточчына" спрабуе дапамагчы ў іх вырашэнні.

**К. МЛЫНСКІ.**

## У медыкаў — "Эскулап"

Сваё друкаванае выданне з'явілася ў студэнтаў і выкладчыкаў Гродзенскага медінстытута. Газета пад назвай "Эскулап" выходзіць раз у месяц накладам 200 паасобнікаў. Выданне паведамляе пра цікавыя падзеі ў жыцці інстытута, змяшчае разнастайную інфармацыю.

**П. СТАРАДУБ.**

## "Марозаўскі праект"

Адраджэнню прадпрыймальніцтва ў дзяржавах СНД павінен спрыяць "Марозаўскі праект", які сумесна з расійскім бокам рэалізуе Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця.

Магчыма, і ў Гродна пры непасрэдным удзеле нашага універсітэта будзе створаны найсучаснейшы вучэбна-дзелавы цэнтр. Ініцыятыву тут праявіла кафедра міжнародных эканамічных адносін і міжнароднага права.

Нядаўна ў Гродна пабывалі паважаныя госці: Кен Пастэрнак з Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Уладзімір Вашчанка (прадстаўляе расійскі бок праекта). Ва універсітэце яны правялі дзелавыя перамовы, сустрэліся з рэктарам, кіраўнікамі аблвыканкама і гарвыканкама, прадстаўнікамі цэнтра занятасці, Саюза прадпрыймальнікаў.

Наш універсітэт зможа прыняць актыўны ўдзел у рэалізацыі "Марозаўскага праекта". Нам ёсць што прапанаваць: дасведчаныя выкладчыкі, методыкі, праграмныя прадукты. Будучы вучэбна-дзелавы цэнтр (рашэнне павінна быць прынята ў чэрвені) будзе добрай падтрымкай у развіцці эканомікі Гродзеншчыны.

**В. ЦІХАНОВІЧ.**

## Музейная практыка ў Мінску

Сёлета ўпершыню музейна-экскурсійна-этнаграфічная практыка студэнтаў другога курса гістарычнага факультэта прайшла ў Мінску. Галоўнай базай практыкі стаў Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Сумесна з навуковымі супрацоўнікамі экскурсійна-лекцыйнай службы была распрацавана праграма лекцый па музеязнаўству і гісторыі мастацтва, праграма экскурсій па залах музея, а таксама прачытаны лекцыі. Студэнты мелі магчымасць самастойна працаваць у залах і фондах, работнікі музея аказвалі вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы рэфератаў. Акрамя таго, практыканты наведалі нацыянальны музей Гісторыі і культуры, музей Вялікай Айчыннай вайны, Дом-музей І з"езда РСДРП, этнаграфічны музей у Раўбічах.

Найбольш уражанняў засталося ад наведвання музеяў М. Багдановіча і Гісторыі беларускай культуры, якія знаходзяцца ў Траецкім прадмесці Мінска. Літаратурныя музеі новыя, іх экспазіцыя нясе ў сабе шмат дагэтуль невядомых, арыгінальных матэрыялаў. Студэнты адзначылі высокі ўзровень правядзення экскурсій.

Музей старажытнабеларускай культуры пры інстытуце этнаграфіі АН Беларусі цікавы экспанатамі — тут вельмі шырока прадстаўлены мастацкія творы XIV—XVIII ст.ст., шмат энтаграфічнага матэрыялу.

Музеі-кватэры — спецыфічны тып музеяў. Яны нясуць багатую інфармацыю жыцця, дзейнасці, творчасці выдатных беларускіх пісьменнікаў Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі. У музеі Я. Коласа адбылася цікавая сустрэча студэнтаў з сынам пісьменніка Данілам Луцэвічам, які працуе старэйшым супрацоўнікам музея.

На ўстаноўчай канферэнцыі кожны студэнт атрымаў заданне па практыцы і таму ў Мінску ў вольны час працаваў над рэфератамі і дзённікамі. Многія з іх самастойна наведалі зацікавіўшыя іх музеі і экспазіцыі, нацыянальную бібліятэку, архівы. Актыўнымі ў гэтым накірунку былі Віктар Пушкар, Аксана Дуднікіна, Святлана Гуцько, Таццяна Булацэвіч, Наталля Буднік, Жана Папко і іншыя. Практыканты аналізавалі узровень, інфармацыю кожнага занятка, экскурсіі, выказвалі свае заўвагі і вывады. Адначасова збіралі матэрыялы для курсавых прац. У іх адносінах адчуваўся ўважлівы, станоўчы падыход да працы, свядомасць таго, што ўсе гэта ім спатрэбіцца як спецыялістам. Менавіта так лічылі многія, але не ўсё — часам праяўлялася незадаволенасць і жаданне звесці працу да адпачынку.

Разам з практыкантамі ў Мінску працавалі супрацоўнікі аддзела ТСН Віктар Махнач і Сяргей Амелька. Мы ім ўдзячны за здымкі і стварэнне відэафільма па музейнай практыцы. Гэта будзе каштоўны ўклад у відэафонд універсітэта. На першай дэманстрацыі стала відавочным, што яго можна выкарыстоўваць у час правядзення заняткаў па гісторыі беларускай культуры, гісторыі Беларусі, музейнай практыцы, арганізацыі самастойнай працы студэнтаў.

Вынікі музейнай практыкі падведзены на канферэнцыі. Акрамя гэтага, адбылася абарона рэфератаў, афармляецца альбом па дадзенай тэматыцы.

**Л. БЯРЭЙШЫК,**
**дацэнт кафедры гісторыі Беларусі,**
**С. СІЛЬВЕРСТАВА,**
**дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.**

## У нашых студэнтаў нядрэнныя адносіны да французскай культуры

10—11 траўня 1994 года ў Мінску ў тэатры юнага гледача па ініцыятыве пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь праходзіў рэспубліканскі фестываль самадзейнага французскага тэатру. У ім прымалі ўдзел студэнты і вучні школ рэспублікі. З вышэйшых навучальных устаноў былі прадстаўлены Мінскі лінгвістычны універсітэт і Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы, гістарычны факультэт. Студэнты Гродзенскага універсітэта выступілі з п'есай Рамэна Ралана "П'ер і Люс" і "Эсмеральда" Віктора Гюго.

Папярэдне гэтыя творы прайшлі апрабацыю на фанэтычным конкурсе Гродзенскага універсітэта, які адбыўся 28 красавіка. У ім прымалі ўдзел студэнты І—ІІІ курсаў гістарычнага факультэта, якія вывучаюць французскую мову ў якасці дадатковай спецыяльнасці. Добра паказалі сябе студэнты І курса Дзямбіцкі Уладзімір, Абрамовіч Таццяна, Зайко Вольга, Павіна Алена, Раманоўская Ала; студэнты ІІ курса Вярбіцкая Алена, Даманоўская Таццяна, Жылінская Алена, а таксама студэнты ІІІ курса Кузняцова Валерыя, Міхальчук Сяргей, Васілевіч Святлана. Кіраўніком і ініцыятарам гэтага конкурсу была старшы выкладчык французскай мовы Істоміна Часлава Іосіфаўна.

На ім прагучалі лепшыя вершы французскіх аўтараў, такіх як Віктора Гюго, Жака Прэвэра, Поля Верлена, Рамэна Ралана, басні Ла Фантэна пад музычнае і танцавальнае суправаджэнне.

Прыемна ўсведамляць, што на фестывалі ў Мінску былі адзначаны ўсе ўдзельнікі, а таксама індывідуальныя асаблівасці кожнага калектыву. Наш калектыў адзначылі за навізну п'есы і добры каментар.

Напэўна, надоўга застанецца ў памяці гэты фестываль яшчэ і па той прычыне, што яго ацэньвала прадстаўнічае журы ў асобе спадара Аляксандра Талстога, саветніка па культурнаму і навуковаму супрацоўніцтву пры пасольстве Францыі ў Мінску, спадарыні Марціны Лефэвр, аташэ па лінгвістыцы, Карыны Жолівэ, асістэнткі Мінскага лінгвістычнага універсітэта, галоўнага дэкаратара Ларысы Рулёвай і акцёра Тэатру юнага гледача Уладзіміра Макарава, а ўзнагароды ўручаў сам пасол Францыі.

Гэта была наша першая спроба прадэманстраваць свае веды па французскай мове і акцёрскія здольнасці. У перспектыве мы спадзяёмся прадоўжыць гэтае цудоўнае пачынанне.

**В. КУЗНЯЦОВА,**
**студэнтка ІІІ курса гістарычнага факультэта.**

## Не ў Цюмень, а ў Крым

Не ў Цюмень, а ў Крым паедзе універсітэцкі будаўнічы атрад. Сібірскі варыянт, на жаль, не атрымаўся, таму тэрмінова давялося шукаць замену. І пры дапамозе калег з Брэста знайшлі.

У канцы ліпеня будатрад нашага універсітэта у складзе 45 чалавек накіруецца ў адзін з крымскіх саўгасаў, дзе хлопцы і дзяўчаты будуць збіраць вінаград. Студэнты самі аплоцяць праезд, затое харчаванне і дах над галавой забяспечыць ім саўгас. Як прыемны дадатак да працоўнага лета,— цёплае Чорнае мора, куды можна будзе выбрацца ў вольную часіну.

**П. СЦЕПАНЧУК.**

## Адысей з Беларусі

У мінскім выдавецтве "Полымя" выйшла кніга Віталя Гузанава "Адысей з Беларусі". У ёй распавядаецца пра Іосіфа Гашкевіча — вядомага вучонага, складальніка першага руска-японскага слоўніка, удзельніка кругасветнага падарожжа на фрэгаце "Палада".

Дарэчы, багаты матэрыял аб жыцці і навуковай дзейнасці Іосіфа Гашкевіча сабралі краязнаўцы Астравецкага раёна. Там заснаваны фонд імя Гашкевіча.

**З.КАПЛУН.**

## Якія б цяжкія часы не пераўжывалі людзі, літаратура заўсёды будзе выклікаць у іх цікаўнасць

У красавіку ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Узаемадзеянне еўрапейскіх літаратур: праблемы творчых метадаў XIX—XX ст. ст.", якую праводзілі кафедра беларускай літаратуры і кафедра рускай і замежнай літаратуры. Тэма выклікала значны інтарэс, аб чым сведчыла колькасць заявак на ўдзел у ёй—іх даслалі 50 чалавек з розных гарадоў Расіі, Украіны, Польшчы і Беларусі. На жаль, эканамічныя цяжкасці не далі магчымасці ўсім жадаючым прыехаць у Гродна.

На пленарным пасяджэнні з прывітальным словам выступіў праф. В. П. Таранцей і дэкан факультэта беларускай філалогіі і культуры дацэнт І. В. Жук, якія пажадалі плённай працы і поспехаў у навуковых даследаваннях.

З грунтоўным дакладам выступіў праф. С. І. Кармілаў (Масква), які вызначыў асноўныя тэндэнцыі сусветнага літаратурнага працэсу ў XX ст., у першую чаргу спыніўшыся на праблеме суадносін рускай савецкай літаратуры і літаратуры Рускага Замежжа.

З цікавым дакладам выступіў дацэнт К. І. Лецка (Гродна), які паставіў пытанне аб перадумовах узнікнення еўрапейскага рамантызму і яго першаасновах.

У дакладзе прафесара Э. Малэка (Лодзь) прагучала думка аб тым, што "несур'ёзныя жанры" (анекдоты) аказвалі значны ўплыў на развіццё "высокай" літаратуры.

Работа канферэнцыі праходзіла па секцыях.

# ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Я. КУПАЛЫ

## АБ`ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1994--1995 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

### НА ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

матэматыка; біялогія; гісторыя; беларуская мова і літаратура; руская мова і літаратура; педагогіка і методыка пачатковага навучання; фізічная культура і спорт; правазнаўства; міжнародныя эканамічныя адносіны.

### НА ДЗЁННАЕ НАВУЧАННЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

**Фізіка:** кваліфікацыі -- "Фізік" або "Фізік. Выкладчык фізікі", "Інжынер-фізік", "Настаўнік фізікі і інфарматыкі".

**Радыёфізіка:** кваліфікацыі -- "Радыёфізік" або "Інжынер-радыёфізік".

**Прыборабудаванне:** кваліфікацыі -- "Інжынер-оптык-тэхнолаг" або "Інжынер-оптык".

**Тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў:** кваліфікацыя -- "Інжынер-механік".

**Матэматыка:** кваліфікацыі -- "Матэматык" або "Матэматык. Выкладчык матэматыкі", або "Настаўнік матэматыкі і інфарматыкі".

**Эканамічная кібернетыка:** кваліфікацыя -- "Матэматык-эканаміст".

**Правазнаўства:** кваліфікацыя -- "Юрыст".

**Міжнародныя эканамічныя адносіны:** кваліфікацыя -- "Эканаміст".

**Біялогія:** кваліфікацыя -- "Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі".

**Экалогія:** кваліфікацыі -- "Эколаг-біёлаг" або "Эколаг-хімік".

**Гісторыя:** кваліфікацыі -- "Гісторык" або "Гісторык. Выкладчык гісторыі".

**Педагогіка і методыка пачатковага навучання:** кваліфікацыі -- "Настаўнік пачатковых класаў, музыкі і спеваў", або "Настаўнік пачатковых класаў і выяўленчага мастацтва", або "Настаўнік пачатковых класаў і фізічнай культуры".

**Музыка і спевы:** кваліфікацыя -- "Настаўнік музыкі і спеваў і сусветнай і айчыннай культуры".

**Выяўленчае мастацтва і чарчэнне:** кваліфікацыя -- "Настаўнік выяўленчага мастацтва, чарчэння і сусветнай і айчыннай культуры".

**Псіхалогія:** кваліфікацыя -- "Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі".

**Беларуская мова і літаратура:** кваліфікацыя -- "Філолаг. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры".

**Руская мова і літаратура:** кваліфікацыі -- "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры" або "Філолаг. Выкладчык рускай мовы і літаратуры і рыторыкі".

**Класічныя мовы і літаратуры:** кваліфікацыя -- "Філолаг. Выкладчык класічных моваў і антычнай літаратуры".

**Англійская мова:** кваліфікацыя -- "Настаўнік англійскай і нямецкай моў".

**Нямецкая мова:** кваліфікацыя -- "Настаўнік нямецкай і англійскай моў".

**Французская мова:** кваліфікацыя -- "Настаўнік французскай і англійскай моў".

**Славянская мова і літаратура:** кваліфікацыі -- "Філолаг. Выкладчык польскай мовы і літаратуры" або "Філолаг. Выкладчык польскай мовы і літаратуры і беларускай мовы і літаратуры".

**Фізічная культура і спорт:** кваліфікацыі -- "Настаўнік фізічнай культуры і біялогіі" або "Настаўнік фізічнай культуры. Метадыст-арганізатар фізкультурна-аздараўленчай работы", або "Настаўнік фізічнай культуры. Інструктар дашкольнага фізічнага выхавання".

**Прыём заяў на завочнае навучанне з 20 чэрвеня па 5 ліпеня, уступныя экзамены з 6 ліпеня па 15 ліпеня. Прыём заяў на дзённае навучанне з 27 чэрвеня па 15 ліпеня, уступныя экзамены з 16 ліпеня па 3 жніўня.**

**Да заявы аб прыёме прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 фотакартак памерам 3х4, медыцынская даведка па форме № 086-у; на навучанне без адрыву ад вытворчасці -- выпіска (копія) з працоўнай кніжкі. Пашпарт абітурыенты прад`яўляюць асабіста.**

Атрымаць бясплатную вышэйшую адукацыю на конкурснай аснове маюць права асобы, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі. Звыш кантрольных лічбаў прыёму на падставе дагавароў з аплатай навучання ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы могуць залічвацца грамадзяне Беларусі, а таксама жыхары іншых дзяржаў СНД, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены.

Уступныя экзамены дзеляцца на профільныя (конкурсныя) і няпрофільныя, якія ацэньваюцца па сістэме "залік" і "незалік".

Абітурыенты, якія паступаюць на **дзённае навучанне**, здаюць наступныя экзамены па спецыяльнасцях:

фізіка, радыёфізіка, прыборабудаванне, тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў: профільныя -- фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна);

матэматыка: профільныя -- матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

эканамічная кібернетыка: профільныя -- матэматыка (пісьмова), інфарматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна), фізіка (вусна);

правазнаўства: профільныя - гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), няпрофільны -- матэматыка (вусна);

міжнародныя эканамічныя адносіны: профільныя -- матэматыка (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), гісторыя (пісьмова);

біялогія, экалогія: профільныя -- біялогія (пісьмова), хімія (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна), няпрофільны -- матэматыка (вусна);

гісторыя: профільныя -- гісторыя (пісьмова), беларуская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна);

педагогіка і методыка пачатковага навучання: профільныя -- беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), замежная мова (вусна), няпрофільны -- гісторыя Беларусі (вусна);

музыка і спевы: профільныя - спецінструмент, тэорыя музыкі, вакал, беларуская мова і літаратура (вусна), няпрофільны -- гісторыя Беларусі (вусна);

выяўленчае мастацтва і чарчэнне: профільныя -- кампазіцыя (тэматычнае заданне), малюнак, жывапіс, беларуская мова і літаратура (вусна), няпрофільны -- гісторыя Беларусі (вусна);

псіхалогія: профільныя - біялогія (пісьмова), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна), няпрофільны -- замежная мова (вусна);

беларуская мова і літаратура: профільныя - беларуская літаратура (творчае сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна); няпрофільныя -- беларуская мова (дыктоўка), гісторыя Беларусі (вусна);

руская мова і літаратура: профільныя -- руская мова (дыктоўка), руская мова і літаратура (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна);

славянская мова і літаратура: беларуская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна);

англійская мова: профільныя -- англійская мова (пісьмова), англійская мова (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

нямецкая мова: профільныя -- нямецкая мова (пісьмова), нямецкая мова (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

французская мова: профільныя -- французская мова (пісьмова), французская мова (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

класічныя мовы і літаратуры: профільныя -- замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна), гісторыя (вусна);

фізічная культура і спорт: профільныя -- біялогія (вусна), агульная і фізічная падрыхтоўка, беларуская мова і літаратура (вусна).

Абітурыенты, якія паступаюць на **завочнае навучанне**, здаюць наступныя экзамены па спецыяльнасцях:

матэматыка: профільныя -- матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна);

біялогія: профільныя -- біялогія (пісьмова), хімія (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна);

гісторыя: профільныя -- гісторыя (пісьмова), беларуская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна);

беларуская мова і літаратура: профільныя -- беларуская мова (дыктоўка), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна);

руская мова і літаратура: профільныя -- руская мова і літаратура (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна), замежная мова (вусна);

педагогіка і методыка пачатковага навучання: профільныя -- беларуская мова і літаратура (сачыненне), матэматыка (вусна), няпрофільны -- гісторыя Беларусі (вусна);

фізічная культура і спорт: профільныя -- біялогія (вусна), агульная фізічная падрыхтоўка, беларуская мова і літаратура (вусна);

правазнаўства: профільныя -- гісторыя (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), няпрофільны -- матэматыка (вусна);

міжнародныя эканамічныя адносіны: профільныя -- матэматыка (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), гісторыя (пісьмова).

Абітурыенты, якія не вывучалі беларускую мову (не маюць адзнакі ў дакуменце аб сярэдняй адукацыі), але вывучалі беларускую літаратуру, здаюць экзамен па беларускай літаратуры (вусна), а абітурыенты, якія не вывучалі беларускую мову і літаратуру, здаюць экзамен па рускай мове і літаратуры (сачыненне). Гэта не датычыцца абітурыентаў, паступаючых па спецыяльнасці беларуская мова і літаратура, педагогіка і методыка пачатковага навучання, славянская мова і літаратура.

Уступны экзамен па замежнай мове (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) абітурыенты могуць здаваць па выбары, незалежна ад таго, якую замежную мову яны вывучалі ў сярэдняй навучальнай установе. Выключэннем з`яўляецца спецыяльнасць "Замежная мова", пры паступленні на якую абітурыенты здаюць уступны экзамен па замежнай мове ў адпаведнасці з абранай спецыяльнасцю.

Асобы, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці па мэтаваму накіраванню і маюць залаты ці сярэбраны медаль, могуць быць залічаны па выніках субяседавання. Калі яны не будуць рэкамендаваны да залічэння па выніках субяседавання, то яны здаюць уступныя экзамены.

Асобы, узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, закончыўшыя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ці прафесійна-тэхнічныя вучылішчы на базе няпоўнай сярэдняй школы з дыпломам з адзнакай і паступаючыя на спецыяльнасці: правазнаўства, міжнародных эканамічных адносін, замежных моў, -- здаюць два экзамены, якія ўказаны першымі для абранай спецыяльнасці. Калі ж яны паступаюць на іншыя, вышэй аб`яўленыя спецыяльнасці, тады яны здаюць толькі адзін экзамен, які ўказаны першым для абранай спецыяльнасці. Пры атрыманні "пяць" яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, а пры атрыманні станоўчай адзнакі, меншай пяці, здаюць астатнія экзамены.

Пераможцы (І, ІІ, ІІІ месца) рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд выпускнікоў школ і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1993/94 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці залічваюцца без уступных экзаменаў.

Пераможцы (І, ІІ, ІІІ месца) абласнога тура алімпіяд выпускнікоў школ 1993/94 навучальнага года, што праводзіліся органамі кіравання адукацыяй Рэспублікі Беларусь па агульнаадукацыйнах прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці вызваляюцца ад уступнага экзамену па гэтай дысцыпліне з выстаўленнем "пяць".

Уступныя экзамены (акрамя экзаменаў па малюнку, музыцы і агульнай фізічнай падрыхтоўцы) праводзяцца па праграмах, якія адпавядаюць вучэбным праграмам сярэдняй агульнаадукацыйнай школы і зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Залічэнне праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных паступаючымі на ўступных профільных экзаменах, пры атрыманні станоўчых адзнак па няпрофільных экзаменах.

На спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка, прыборабудаванне, тэхналогія і абсталяванне высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў праводзіцца агульны конкурс (па фізіка-тэхнічнаму факультэту), а ў іншых выпадках конкурс будзе праводзіцца па спецыяльнасцях.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца: воіны-інтэрнацыяналісты; дзеці інвалідаў вайны і загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў; круглыя сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў; інваліды І і ІІ груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі; асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС". Пераважнае права на залічэнне пры іншых роўных умовах маюць інваліды ІІІ групы, якія не маюць медыцынскіх супрацьпаказанняў і асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 вышэйназванага Закона Рэспублікі Беларусь.

На завочную форму навучання прымаюцца: выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, якія паступаюць на роднасныя спецыяльнасці; інваліды, якім не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ; ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас на працягу трох апошніх гадоў; асобы, якія працуюць па профілю абранай спецыяльнасці, як правіла, не менш за 6 месяцаў. На астатнія месцы могуць прымацца іншыя асобы на падставе дагавароў паміж ВНУ і зацікаўленымі прадпрыемствамі, установамі, калгасамі, саўгасамі, фірмамі, кааператывамі, фізічнымі асобамі з аплатай навучання.

На скарочаны тэрмін навучання (3 гады) па спецыяльнасці "Педагогіка і методыка пачатковага навучання" прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю па спецыяльнасці і працуюць настаўнікамі пачатковых класаў.

Залічэнне на дзённую і завочную форму навучання праводзіцца да 5 жніўня. З 5 па 15 ліпеня для абітурыентаў ва універсітэце працуюць платныя падрыхтоўчыя курсы.

**Дакументы накіроўваюцца на адрас:**

**230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, універсітэт, прыёмная камісія (пакой 209), тэлефон 44-51-03.**

Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшкі, 22 пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць
адзін раз у месяц.
Аб`ём газеты --
адзін друкаваны аркуш.

Газета надрукавана
афсетным спосабам
у Гродзенскай абласной
узбуйнёнай друкарні
г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4
Падпісана да друку ў 15.00

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
ВУЧОНАЯ РАДА УНІВЕРСІТЭТА,
ПРАФКАМ СУПРАЦОЎНІКАЎ,
ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.

Зак. 2389

Рэдактар
М. КАРНЕВІЧ.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421

Тыраж 1000 асобнікаў